# СЕННЕНСКА-АРШАНСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ ЗОНА

**Дата існавання** да жніўня 1942 – 1944

**Месца:** Беларуская ССР, Віцебская вобласць, Аршанскі раён, Сенненскі раён, Багушэўскі раён, Талачынскі раён

**Партызанскія фарміраванні:**

1-я Беларуская брыгада (2-га складу),
1-я брыгада імя К. С. Заслонава,
2-я Беларуская брыгада імя П. К. Панамарэнкі (2-га складу),
2-я брыгада імя К. С. Заслонава,
Багушэўская брыгада,
брыгада «Граза»,
брыгада «Імя М. П. Гудкова»,
брыгада «Імя А. Ф. Данукалава»,
Лёзненская брыгада,
Сенненская брыгада і інш.

**Сенненска-Аршанская партызанская зона** (да жніўня 1942 – 1944) – тэрыторыя на поўдні Віцебскай вобласці, у міжрэччы Заходняй дзвіны, Дняпра, Улы, Лукомкі, Бабра, якая кантралявалася партызанамі. Склалася да жніўня 1942 г. як ваенна-палітычны плацдарм для барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі на чыгуначных магістралях Барысаў – Орша – Смаленск, Віцебск – Орша і аховы мясцовага насельніцтва ад карнікаў. На тэрыторыі зоны, якая ўключала Аршанскі, Сенненскі, Багушэўскі і Талачынскі раёны, вялі барацьбу з акупантамі 13 партызанскіх брыгад, каля 12 тысяч партызан.

Стварэнне партызанскай зоны звязана з фарміраваннем і актыўнай баявой дзейнасцю партызанскіх брыгад імя А. Ф Данукалава, Багушэўскай, 1-й імя К. С. Заслонава, «Граза», М. П, Гудкова, Сенненскай, спецгруп, якія былі закінуты з Вялікай зямлі. Пад кантролем партызан да канца 1942 г. знаходзілася ад 50 да 70 % Аршанскага, Талачынскага і іншых раёнаў. Да верасня 1943 г. колькасць партызанскіх фарміраванняў у зоне, якая да гэтага часу займала каля 1500 км$^2$, значна павялічылася ў сувязі з перадыслакацыяй сюды Смаленскага партызанскага палка, 1-й і 16-й Смаленскіх партызанскіх брыгад, а таксама з фарміраваннем на тэрыторыі зоны новых партызанскіх брыгад: 1-й Беларускай (2-га складу) і 2-й Беларускай імя П. К. Панамарэнкі (2-га складу), Лёзненскай, 2-й імя К. С. Заслонава. Кіраўніцтва абаронай і ўнутраным жыццём Сенненска-Аршанскай партызанскай зоны ажыццяўлялі Беларускі штаб партызанскага руху, Віцебскі падпольны абкам КП(б)Б, Сенненскі, Аршанскі, Багушэўскі, Талачынскі, Дубровенскі падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ. Партызанскія фарміраванні зоны цесна ўзаемадзейнічалі з падпольшчыкамі Оршы, Віцебска, пасёлка Асінторф і інш. У найбольш цяжкія перыяды барацьбы з карнікамі на дапамогу партызанам зоны прыходзілі партызанскія фарміраванні Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы.

Гітлераўцы неаднаразова спрабавалі ліквідаваць зону. У канцы лета 1942 г. камандаванне

групы нямецкіх армій «Цэнтр» вырашыла некалькімі карнымі аперацыямі на працягу месяца ачысціць ад партызан раён паміж Оршай, Віцебскам і Смаленскам. 17 жніўня карнікі атакавалі партызанскую брыгаду К. С. Заслонава, атрады «Меч» і «Хуткі», спецатрады Н. В. Сакалова, Ф. Ф. Азміцеля («Грозны»), атрады І. А. Яцына, М. І. Талеркі, атрад смаленскіх партызан пад камандаваннем М. В. Антоненкава і 2 атрады брыгады К. В. Зюкава, што занялі кругавую абарону на рубяжы р. Альшанка. Тры дні партызаны стрымлівалі націск ворага, потым раптоўнай фланговай контратакай нанеслі праціўніку вялікія страты. На наступны дзень намнога большыя сілы карнікаў адцяснілі партызан у Азёрскі лес і па р. Бабровіца замкнулі кальцо блакады. У ноч на 21 жніўня партызаны пад камандаваннем К. С. Заслонава прарваліся каля в. Цагельня Смаленскай вобласці і выйшлі да возера Ардашава ў Сафіеўскі лес, у раён дыслакацыі Багушэўскай партызанскай брыгады. У пачатку верасня гітлераўцы ўвялі ў бой у раёне Сянно 201-ю ахоўную дывізію. У абарону ўключыліся партызанскія брыгады «Чэкіст», «Граза», М. П. Гудкова. 17 верасня праціўнік пачаў адвод войск з раёна карных аперацый, суправаджаючы адступленне падпалам вёсак, рабаваннем і гвалтам мясцовага насельніцтва.

У верасні-кастрычніку 1942 г. партызаны ўступілі ў бой з карнікамі на паўднёва-заходніх межах зоны. Асноўны ўдар прынялі на сябе партызанскія брыгады «Чэкіст» і 8-я Круглянская паміж Барысавам і Талачыном на поўдзень ад чыгункі Барысаў – Орша. У лістападзе ў цэнтральную частку зоны ўварвалася новае буйное фарміраванне карнікаў. Яно пачало прасоўвацца з раёна Смалян у напрамку сканцэнтравання брыгады Заслонава. 14 лістапада ў баі з карнікамі ў в. Купаваць Сенненскага раёна загінуў камандзір брыгады К. С. Заслонаў.

Вялікія баі з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў партызанскай зоне адбыліся ў канцы верасня-кастрычніка 1943 г. Абарончыя баі ахапілі вялізны раён паміж чыгункай Лепель – Орша і шашой Мінск – Магілёў. Вясной-летам 1944 г. партызанскія фарміраванні адбілі націск праціўніка ў карнай аперацыі «Прагулка на сёмуху» і ўтрымлівалі свае пазіцыі на падыходзе да чыгункі Мінск – Орша.

Толькі ў пачатку чэрвеня 1944 г. гітлераўцам удалося значна пацясніць партызан, аднак выкарастаць атрыманую перавагу яны не паспелі. Пачалася Беларуская наступальная аперацыя 1944 г.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Багамазаў, У. С.** Партызанскі рух / У. С. Багамазаў // Памяць: Орша. Аршанскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] ; уклад.: Т. Г. Ігнацьева [і інш.] ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1999. – Кн. 1. – С. 332–334.

2. **Партизанские** зоны // Беларусь партизанская = Guerrilla Belarus : иллюстрированная энциклопедия партизанского движения в Беларуси в годы Великой Отечественной войны / под общ. ред. А. М. Литвина ; пер. на англ.: А. В. Титова, Н. Ю. Жданова. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2019. – С. 91–101. – (Беларусь помнит: во имя жизни и мира).

3. **Партизанское** движение на Оршанщине в 1941–1944 гг.: возникновение, основные периоды развития, итоги боевой деятельности партизанских бригад им. К. С. Заслонова // Орша в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг. : краткий документально-исторический очерк / В. С. Богомазов. – Орша : Оршанская типография, 1994. – С. 62–67.

4. **Пасэ, У. С.** Сенненска-Аршанская партызанская зона / У. С. Пасэ // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 558–559.